Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 СТУДЗЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК № 1 (28365)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Новае ў падтрымцы сем'яў з дзецьмі

СТАР. 4



Як ствараўся БССР

СТАР. 6




Хакей на Каляды

СТАР. 7

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый БАРАДЗЕНЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах:**

*«Мэты на 2017 г. вельмі амбіцыйныя. Мы да іх імкнемся ўжо шмат гадоў, але сёлета работу ў гэтым напрамку трэба будзе інтэнсіфікаваць. Гаворка ідзе аб інавацыйным развіцці на аснове стварэння новых высокапрадукцыйных працоўных месцаў, што дазваляе выпускаць прадукцыю з высокім дабаўленым коштам. Якраз на гэтай аснове мы будзем імкнуцца да павышэння даходаў насельніцтва. Рэалізацыя гэтай мэты дазволіць не толькі стварыць умовы, у якіх кожны чалавек на сваім працоўным месцы зможа зарабляць больш, але і павысіць эфектыўнасць эканомікі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.01.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9585 |
| Еўра | 2,0450 |
| Рас. руб. | 0,0324 |
| Укр. грыўня | 0,0720 |

ISSN 1990 - 763X

# ГОД АБНАЎЛЕННЯ І АДКРЫЦЦЯЎ

## Навагодні зварот Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа



Фота БЕЛТА.

***Дарагія суайчыннікі і госці Беларусі!***

Адыходзіць у гісторыю чарговы год трэцяга тысячагоддзя: складаны, яркі і шматаблічны.

Для некага ён быў сумным і журботным у сувязі са стратай родных і блізкіх, нехта не дасягнуў жаданай мэты. У некага не склалася ў сям'і, прафесійнай кар'еры.

**Але ўпэўнены: для большасці год быў радасным і шчаслівым.** Таму што пражылі яго недарэмна: любілі, весяліліся на вяселлях, пачынаючы новае жыццё, усміхаліся, упершыню пачуўшы родны голас немаўляці. І тыя, хто ставіў перад сабой амбіцыйныя задачы і мэты, пераадольваючы цяжкасці, ішоў да іх, адчулі радасць перамогі!

Суверэнная і незалежная **Беларусь апынулася ў эпіцэнтры сусветных геапалітычных і эканамічных падзей.** Мы жывем у адкрытай краіне і перш за ўсё таму сталі заложнікамі той эканамічнай сітуацыі, якая склалася ў нашых традыцыйных эканамічных партнёраў.

У розных кутках планеты ўспыхваюць узброеныя канфлікты, здзяйсняюцца тэракты, абвастраюцца міжнацыянальныя і міжканфесійныя войны.

Захаваць Беларусь астраўком стабільнасці і спакою было няпроста. Але мы гэта зрабілі, забяспечыўшы мір і бяспеку грамадзян!

**Нашы суседзі, сябры, брацкія народы павінны ведаць, што з беларускай зямлі ніколі не будзе агрэсіі і пагроз.**

У той жа час мы, людзі ў пагонах, ведаем: порах трэба трымаць сухім. Абарона Айчыны — наш святы абавязак!

Крок за крокам Беларусь умацоўвае свой аўтарытэт у міжнароднай супольнасці. Асаблівага прызнання яна ўдастоілася, стаўшы пляцоўкай міралюбных ініцыятыў. **Прыязнасць, гасціннасць, адкрытасць да супрацоўніцтва прыцягваюць да нас сімпатыі многіх народаў.**

У нас узважаная міжнародная і вывераная ўнутраная палітыка. **Пастаянную ўвагу ўдзяляем умацаванню адзінства народа, недапушчэнню экстрэмісцкіх праяў,** распальвання варожасці на нацыянальнай і рэлігійнай глебе. Палітычныя кампаніі мінулага года паказалі грамадзянскую сталасць і культуру нашых людзей.

Мы разам вызначылі прыярытэты і асноўныя напрамкі развіцця краіны. Упэўнены, яны будуць рэалізаваны ў поўнай меры ў наступныя гады.

У гэтым нас пераконвае ўвесь шлях суверэннай беларускай дзяржавы, які даў бясцэнны вопыт пераадолення цяжкасцяў і вырашэння праблем, уменне знаходзіць адэкватныя адказы на выклікі і пагрозы.

**Мы ствараем новыя вытворчасці, будуем дарогі, электрастанцыі, важныя сацыяльныя аб'екты і жылыя дамы.** Добраўпарадкуем гарады і вёскі. З кожным годам Беларусь набывае ўсё больш сучаснае еўрапейскае аблічча.

Узіраючыся ў будучыню, вялікія надзеі ўскладаем на **2017 год**. Ён павінен стаць пераломным і **даць магутны імпульс для развіцця краіны.**

Стаўку зробім на стварэнне новых вытворчасцяў і працоўных месцаў, актывізацыю бізнесу.

**Важную ролю мы адводзім айчыннай навуцы.** Прыярытэт для нас — інавацыйны шлях. Надыходзячы Год навукі павінен прайсці пад знакам абнаўлення краіны і адкрыццяў ва ўсіх галінах жыццядзейнасці. Але любыя навуковыя дасягненні і распрацоўкі павінны эфектыўна ўкараняцца ў вытворчасць.

Рэалізацыя гэтага курсу дазволіць нам **забяспечыць людзей работай, годнай зарплатай.** Узровень жыцця народа павінен быць значна вышэйшы, чым сёння. Дасягнуць гэтага няпроста. Аднак чаго б нам ні каштавала, мы ўжо ў надыходзячым годзе істотна павысім даходы грамадзян.

У 2016 годзе ўпершыню з моманту атрымання незалежнасці ў нас **дасягнуты натуральны прырост насельніцтва.** У сем'ях з'яўляецца ўсё больш дзетак, і гэта — будучыня Беларусі. Трэба захаваць такую станоўчую тэндэнцыю. Звяртаюся да нашых дарагіх жанчын — нараджайце і ведайце: як бы ні было складана, мы захаваем падтрымку сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей: прадастаўленне мацярынскага капіталу, дапамог, а таксама забеспячэнне жыллём шматдзетных сем'яў.

Старэйшае пакаленне шмат зрабіла для нашай краіны. І мы ўдзячныя ім за гэта. Але цяпер трэба рухацца далей, укараняць у жыццё ўсё больш прагрэсіўнае і карыснае. А для гэтага трэба вучыцца, удасканальвацца, ісці ў нагу з часам.

Свае слова павінна сказаць наша моладзь, патрыятычная, неабыякавая да лёсу сваёй Радзімы. Сярод вас шмат здольных людзей.

Я веру ў вас і спадзяюся, што вы знойдзеце сваё месца ў роднай Беларусі, годнае прымяненне талентам і здольнасцям. Атрыманы 25 гадоў таму суверэнітэт сёння ў вашых руках, і ад вас зараз залежыць будучы росквіт Айчыны.

**У гэтыя імгненні адыходзячага года выказваю словы глыбокай удзячнасці ўсім вам, маім суайчыннікам.** Дзякуй за самаадданую працу ў заводскім цэху і на хлебнай ніве, каля школьнай дошкі і за аперацыйным сталом, на чыгуначных лініях і за штурваламі самалетаў, у канструктарскіх бюро і лабараторыях, на будоўлі і ў лясной гаспадарцы, у шахце і на баявым дзяжурстве.

Гэта дзякуючы вашым высокім чалавечым якасцям, прафесіяналізму і вернасці абавязку мы маем магчымасць цяпер сабрацца за святочным сталом, спяваць, жартаваць, загадваць жаданні і з аптымізмам глядзець у заўтрашні дзень.

І яшчэ хачу сказаць вам: дзе б вы ні былі, трэба памятаць цяпло роднага дома, сваіх настаўнікаў, сяброў, зямлю, якая выгадавала вас.

Няхай надыходзячы год прынясе вам поспех і дабрабыт. Перакананы, што так і будзе. Таму што веру ў мудрасць, згуртаванасць, працавітасць нашага народа, у яго бясконцую творчую энергію.

**З Новым годам, дарагія сябры!**

# ДЗЕЛЯ РАЗВІЦЦЯ СЭЗ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які прадугледжвае кампенсацыйныя меры ў сувязі з адменай з 1 студзеня 2017 года існуючых мытных ільгот для рэзідэнтаў свабодных эканамічных зон.**

Гэтыя меры дадуць магчымасць часткова пакрыць ім дадатковыя выдаткі і захаваць канкурэнтаздольнасць выпускаемай прадукцыі на знешнім і ўнутраным рынках.

У прыватнасці, указ устанаўлівае адзіны тэрмін заканчэння дзейнасці беларускіх свабодных эканамічных зон — 31 снежня 2049 года. Гэтая ўмова з'яўляецца важным фактарам для захавання канкурэнтаздольнасці і інвестыцыйнай прывабнасці СЭЗ, якія функцыянуюць на тэрыторыі краіны.

У адпаведнасці з дакументам пашыраюцца межы свабодных эканамічных зон «Брэст», «Гроднаінвест» і «Віцебск». Межы гэтых зон прапануецца змяніць наступным чынам. У СЭЗ «Віцебск» уключыць участак плошчай 231 га для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Будаўніцтва мультымадальнага прамыслова-лагістычнага комплексу ў пасёлку Балбасава Аршанскага раёна». У СЭЗ «Брэст» уключыць восем участкаў агульнай плошчай 3328,7 га, у тым ліку зямельны ўчастак у Брэсце, які прымыкае да мяжы Еўрапейскага саюза і мае ў сваім складзе аўтамабільныя памежныя пераходы «Казловічы» і «Варшаўскі мост», чыгуначны пагранпераход «Брэст», пяць зямельных участкаў у Кобрыне і Кобрынскім раёне плошчай 393,3 га, а таксама зямельныя ўчасткі Баранавіцкага завода аўтаматычных ліній і ААТ «Кузлітмаш» у Пінску. У СЭЗ «Гроднаінвест» уключыць участак плошчай 455 га, на якім будуць створаныя вытворча-сэрвісныя прадпрыемствы і транспартна-лагістычныя цэнтры.

Указ таксама прадугледжвае карэкціроўку аб'ёму інвестыцый з 1 млн еўра да 500 тысяч еўра. Зніжэнне інвестыцыйнага парога да 500 тысяч еўра пры ўмове інвеставання на працягу трох гадоў з дня заключэння дагавора аб умовах дзейнасці ў свабодных эканамічных зонах дазволіць павялічыць колькасць рэзідэнтаў, уключыць у абарот маёмасць, стварыць новыя працоўныя месцы.

У адпаведнасці з указам рэзідэнты СЭЗ вызваляюцца ад ПДВ, які спаганяецца пры закрыцці мытнай працэдуры свабоднай мытнай зоны шляхам змяшчэння выраблених тавараў пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання.

Акрамя таго, уладальнікі свабодных мытных складоў вызваляюцца па 31 снежня 2019 года ад ПДВ, які спаганяецца пры выпуску тавараў для ўнутранага спажывання пасля мытнай працэдуры мытнага склада.

# ПАДТРЫМКА ДЛЯ ТАЛЕНТАЎ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі і выдзелена 317 809 рублёў для мэтавага фінансавання стыпендый, прэмій, грантаў і матэрыяльнай дапамогі таленавітай моладзі.**

Згодна з рашэннем стыпендыятам фонду стаў 21 прадстаўнік таленавітай моладзі, а яго дыпламантамі — 19 чалавек. Прызначаныя 27 заахвочвальных прэмій фонду. Гранд-прэмій фонду з прысуджэннем звання лаўрэата і ўручэннем пасведчання і нагруднага знака лаўрэата ўдастоены пяць чалавек. Матэрыяльную дапамогу атрымаў 41 прадстаўнік моладзі.

Акрамя таго, выдзелены два гранты — Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Мінскаму дзяржаўнаму каледжу мастацтваў на набыццё музычных інструментаў і абсталявання.

# ЯК КРАІНА СУСТРЭЛА 2017-Ы

## Аб гэтым — у рэпартажах нашых карэспандэнтаў і ў яркіх фота

### ПАД БАРАБАННЫ БОЙ

Жыхары і госці Гомеля ўвайшлі ў новы 2017 год пад гукі барабаннага бою ад музык-прафесіяналаў. На цэнтральнай плошчы, дзе ўсталявана галоўная ёлка, прайшла канцэртна-забаўляльная праграма з удзелам барабаннага шоу, лепшых вакальных і танцавальных калектываў горада, а таксама робатаў-трансформераў.

У дзіцячым гарадку з атракцыёнамі заняць малых дапамагалі аніматары. На плошчы таксама быў арганізаваны святочны гандаль напоямі, кандытарскімі вырабамі і сувенірамі ручной работы ад рамеснікаў. Дарэчы, сагрэцца гарачымі чаем і кавай, а таксама паласаваццa кандытарскімі вырабамі можна было да трох гадзін ночы. Канцэртна-забаўляльныя праграмы прайшлі і ў кожным з раёнаў Гомеля на чатырох асноўных пляцоўках.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

*(Працяг тэмы на 3-й стар.)*




**А касманаўт Алег НАВІЦКІ напярэдадні свята віншаваў беларусаў з Новым годам з арбіты МКС.**



Мінск.



Круглае.



Гродна.

Фота БЕЛТА.

■ Май на ўвазе

# НОВАЯ «МІНІМАЛКА», ТАРЫФЫ, ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ І ІНШАЕ

## «Звязда» падсумавала, што змянілася ў нас з першых дзён 2017 года

### Без старых банкнот

Менавіта 31 снежня мінулага года завяршыўся перыяд паралельнага абарачэння банкнот узору 2000 года і грашовых знакаў узору 2009 года. Цяпер у якасці адзінага плацежнага сродку пры наяўных разліках за тавары і паслугі суб'екты гаспадарання будуць прымаць толькі банкноты і манеты новага ўзору. Старыя грашовыя знакі можна абмяняць на новыя на працягу наступных 5 гадоў без абмежаванняў і спагнання камісійнага ўзнагароджання. З 1 студзеня 2017 года па 31 снежня 2019 года ўключна — у Нацыянальным банку, банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях Беларусі, з 1 студзеня 2020 года па 31 снежня 2021 года ўключна — у Нацыянальным банку. З 1 студзеня 2022 года грашовыя знакі ўзору 2000-га стануць несапраўднымі.



Фота БЕЛТА.

### Плюс шэсць месяцаў штогод

Сёлета ў студзені пачынаецца паэтапнае штогадовае павышэнне на 6 месяцаў пенсійнага ўзросту да дасягнення мужчынамі 63 гадоў, жанчынамі — 58 гадоў. Аналагічна (на 3 гады за 6 гадоў) павялічваецца ўзрост, які дае права на льготныя працоўныя пенсіі і пенсіі за выслугу гадоў. Суразмерна агульнаграмадзянскім будзе паступова павышацца лімітавы ўзрост знаходжання на ваеннай службе вайскоўцаў.

У Мінпрацы нам растлумачылі, што з 1 студзеня 2017 года да 2022 года кожны год вызначаецца новы пенсійны ўзрост (для звароту за пенсіяй) шляхам яго павышэння ў адносінах да папярэдняга года на 6 месяцаў. Сёлета для мужчын ён стаў 60 гадоў 6 месяцаў, для жанчын — 55 гадоў 6 месяцаў.

### Большыя заробкі і штрафы

У студзені вырасла базавая велічыня, якая складае цяпер 23 рублі (плюс 2 рублі). З гэтай даты ўрад устанавіў месячную мінімальную заработную плату ў памеры 265 рублёў (плюс амаль 26 рублёў). Разам з базавай велічынёй змяніліся сёлета і памеры штрафаў.

Таму калі раней, скажам, за перавышэнне хуткасці трэба было плаціць ад 21 да 315 рублёў, то цяпер ад 23 да 345 рублёў (ад 1 да 15 базавых). Падаражэе і безбілетны праезд у грамадскім транспарце: 11,5 рубля замест 10,5 рубля летась. За курэнне ў забароненых месцах цяпер аштрафуюць на 4 базавыя, або на 92 рублі.

Пасля павышэння базавай велічыні прапарцыйна зменяцца і дзяржаўныя пошліны. Напрыклад, рэгістрацыя ІП і замена пашпарта вырастуць у цане да 11,5 рубля. А каб заключыць або скасаваць шлюб, трэба будзе заплаціць дзяржаве 69 рублёў.

### Ваду цяпер лепш эканоміць удвая

Яшчэ летась былі зацверджаны новыя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі.

Кошт цеплаэнергіі, гарачага водазабеспячэння і прыроднага газу павялічылі на на 17%. А вось паслуга па водазабеспячэнні і водаадвядзенні прыплюсавала ажно на 90%. Спецыялістамі было падлічана, што па новых тарыфах ЖКП разліковыя плацяжы сям'і з трох чалавек, якая пражывае ў тыпавой двухпакаёвай кватэры, узрастуць на 11 рублёў і складуць у ацяпляльны перыяд каля 80 рублёў. Аплачваць жыроўку па новых тарыфах (цэнах) насельніцтва пачне ў лютым за тыя жыллёва-камунальныя паслугі, якія былі аказаны ў студзені.

Падаваць паказанні лічыльнікаў вады можна будзе праз АРІП. Такая паслуга ў пачатку 2017 года з'явілася ў сістэме АРІП, прычым яна будзе даступная для ўсіх жыхароў Беларусі. Для гэтага не трэба будзе ствараць асобны сайт. Магчымасці, якія раней падаваў партал komplat.by, захаваюцца.

### Зразумелыя цэннікі ў магазінах

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) пачало рэальна прыслухоўвацца да спажыўцоў. Ужо з першых дзён года МАРГ рэкамендуе гандлёвым аб'ектам паказваць цану харчовых прадуктаў за кілаграм і літр. Для харчовых прадуктаў, намінальная колькасць якіх не перавышае 250 г (мл), трэба будзе паказваць кошт адзінкі тавару за 100 г (мл), для астатніх — за 1 кг (л). З 1 ліпеня 2017 года гэту норму плануецца зрабіць абавязковай.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# НОВЫ ГОД ПАД ЛІЧБАЙ 102



**Пакуль краіна святкуе Новы год, тысячы людзей у гэты час працуюць. Напрыклад, вадзіцелі грамадскага транспарту, работнікі культуры, якія забаўляюць нас на цэнтральных плошчах, медыкі... І адпаведны спіс вельмі доўгі. Вось і карэспандэнт «Звязды» вырашыў да яго далучыцца і правёў навагоднюю ноч не за святочным сталом, а з віцебскімі амапаўцамі.**

## «Ну ты даеш!»

Ідэю зрабіць падобны рэпартаж у рэдакцыі падтрымалі. Стараемся здзіўляць тых, хто выбраў менавіта «Звязду». Толькі папрасілі здаць тэкст у першы нумар 2017-га. Без праблем. Чаго не зробіш для сваіх чытачоў.

А вось мае знаёмыя здзіўляліся «вар'яцкай задуме». Некаторыя пыталі: няўжо пасварыўся з жонкай? Яна, дарэчы, да апошняга не верыла ў тое, што я не буду Дзедам Марозам, які ўручыць падарункі дзецям у першыя хвіліны новага года. Сыны, між іншым, адрэагавалі з разуменнем.

— Ты ж працаваць будзеш, — канстатаваў старэйшы, 12-гадовы Міхаіл. Малодшы (жартлівая яго клічу Аляксей Аляксандравіч), якому 5 студзеня споўніцца 9, прамаўчаў.

Іншыя мае таварышы цікавіліся: навошта трэба іссі на рэпартаж непасрэдна ў навагоднюю ноч? Мог бы і, напрыклад, 30 снежня «пакатацца з міліцыяй»... Што цікава, атрымаў некалькі запрашэнняў зайсці ў госці адразу пасля рэпартажу.

І нават мой надзейны напарнік — пазаштатны фатограф Віктар Нікалаеў, пачуўшы прапанову падзяжурыць з міліцыяй пад святочны феерверк, пакруціў пальцам ля скроні і сказаў: «Якаўлевіч, ну, ты даеш». Ён збіраўся святкаваць у цешчы.

У аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама трохі здзівіліся настойліваму жаданню зрабіць рэпартаж менавіта ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня. Таму што традыцыйна навагодняя ноч спакойная. Бо і міліцыі больш, ды і вельмі рэдка нехта хуліганіць, і гэтак далей. І народ наш піць навучыўся. Калі ўжо выходзіць на «ёлкі», на плошчы, дык вядуць сабе годна.

Перспектыва сумнай ночы трохі сапсавала настрой. Як і новыя акумулятарныя батарэі для фотаапарата, якія чамусьці не хацелі зараджацца. Ды і на свята нават глыток шампанскага не выпіў. Але калі ўжо ўзяўся з справу...

## «Паліглоты» ў форме

А дванаццатай гадзіне ночы «УАЗ» з амапаўцамі пад'ехаў да майго дома.

Напрасіўся я ў нарад да старшага прапаршчыка Юрыя Юхневіча, прапаршчыка Уладзіслава Чыстабаева, старшыны Дзяніса Дзьячэнкі. Яны служаць у групе хуткага рэагавання АМАП УУС Віцебскага аблвыканкама.

Юрый носіць форму аж з 1990-га! Сказаў, што хутчэй адкажа, колькі гадоў у навагоднюю ноч быў дома. Усяго двае!

Па дарозе я першай справай пачаў распытваць праваахоўнікаў, ці запомніліся нешта ім з таго, што адбылося ў навагоднюю ноч у мінулыя гады. Хлопцы расчаравалі: адна «руціна». Напрыклад, аднойчы жанчына выклікала міліцыю, каб знайшлі скрадзеныя хатнія нарыхтоўкі: агуркі, памідоры.

— Бывала, што на масавых гуляннях дзеці губляліся. Але мы іх хутка знаходзілі па прыкметах, бо адзенне ў іх яркае, — распавядалі міліцыянеры.

Да таго ж «падабраць» мяне, выязджалі па выкліку. Жанчына, якая жыве ў прыватным доме, паведаміла дзяжурнаму па тэлефону 102, што знікла сумачка з дакументамі, банкаўскай карткай і 500 расійскімі рублямі.

Пад'ехалі да цэнтральнай плошчы — Перамогі. На тратуары стаялі двое маладых мужчын. Я чамусьці падумаў, што гэта падлеткі. Яны падышлі да аўто і запыталі нешта... па-англійску. Сорамна, але я нічога не зразумеў. А вось мае спадарожнікі, выявілася, англійскай валодаюць. Хай і не без цяжкасцяў, але растлумачылі, калі пачнуць пускаць да «галоўнай ёлкі». Бачылі б вы, як радаваліся іншаземцы! Шчыра дзякавалі за дапамогу!

## «Вы столік заказвалі?»

Мы павольна ехалі па горадзе. Глядзелі па баках, чакалі выкліку па рацыі. Заехалі на Прывакзальную плошчу. Там я паспрабаваў фатаграфаваць міліцыянераў. На жаль, як кажуць прафесійныя фатографы, «слабая» камера не дазволіла зрабіць параўнальна якасны здымак. Зрабіць фота з журналістам папрасілі супрацоўніка ДАІ. За што яму дзякуй.

Дарэчы, пра сітуацыю на дарогах. Надвор'е было зусім не навагодняе. Плюсавая тэмпература, плюс перыядычна церусіў дождж. Працаваў грамадскі транспарт. Мяне здзівіла, што, акрамя таксі, ездзілі дзясяткі прыватных легкавушак. Хто і куды ездзіць у навагоднюю ноч? Для мяне гэта так і засталося таямніцай.

Недалёка ад галоўнага корпуса Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта ўбачылі вынік ДТЗ. Адна з легкавушак урэзалася ў агароджу каля трамвайных пуцей...

Зайшлі ў кавярню-клуб. Ахоўнік, убачыўшы мяне, запытаў, ці заказваў я столік. Давялося тлумачыць, што я з міліцыяй прыйшоў. Маіх спадарожнікаў там ведалі, яны не першы раз заходзяць сюды па службе. У зале прыблізна пара дзясяткаў людзей танцавалі. На мой погляд, культурна адпачывалі. Кінулася ў вочы, што жанчын было значна больш.

А вось «публіка» ў кафэ-боўлінгу мне спадабалася менш. Некалькі нецвярозых мужыкоў за сталом. Праўда, вялі сябе пры нас не агрэсіўна.

## «Залез у... халадзільнік»

Усё марыў, каб «нешта цікавае» для рэпартажу здарылася. Па рацыі пачулі, што ў дом у прыватным сектары праніклі і скралі нешта, у тым ліку і з халадзільніка. Сімвалічна! Няўжо злодзеі вырашылі такім чынам выпіць шампанскага і закусіць аліўе?

Хутка прыехалі па адрасу выкліку. Адчыніў дзверы нецвярозы мужчына. У прыхожай быў яшчэ адзін, зусім «ніякі». Высветлілася, што першы — гаспадар дома, другі — «злодзей».

Гаспадар усё паказваў на «госця» пальцам і называў яго «пацуком». Растлумачыў, што дзвярэй сваёй хаты ён не замыкае ніколі. Таму што нікога не баіцца, бо дэсантнік. А вось гэты (далей нецэнзурныя словы)... без дазволу з'явіўся. Амапаўцы папрасілі госця паказаць кішэні. Дакумент, пакет складзены... Ну нічога пры ім з таго, што мог бы скрасці. Няўжо з'еў і выпіў да нашага прыезду? «Злодзей» у нецвярозым трызненні нешта спрабаваў гаварыць. Усміхаўся і смяяўся. Яго павялі да машыны.

У доме, дзе застаўся старшы прапаршчык, пачуўся шум. Я кінуўся туды. Убачыў жанчыну. Высветлілася, што гэта жонка гаспадара. А чаму крычалі? Аказалася, «пацярпелы» пачаў праваказваць міліцыянера. Стаў крычаць, што той пагражаў яму пісталетам, хацеў яго застрэліць. Якія толькі мроі не не з'яўляцца ў галаве чалавека «пад мухай»...

Пакуль мы везлі «злодзея» на агляд у хіміка-таксікалагічную лабараторыю Віцебскага абласнога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і наркалогіі, праспабаваў з ім пагаварыць. Равеснікі, а выглядае жудасна. Адказваў ён са здзекам. Сказаў, што працуе «кольшчыкам». Амапаўцы растлумачылі, што ён гаворыць пра наколкі на целе. Судзімы быў за крадзеж яшчэ ў савецкі час...

У лабараторыі, працягваючы адказваць на пытанні, сказаў, што працаваў рабочым на абутковым прадпрыемстве. Ці хлусіў? Халасты, дзяцей няма...

І наколькі, вы думаеце, ён быў нецвярозым? Прыбор зафіксаваў 2,64 праміле. Да мяжы ў 2,9, калі, як кажуць урачы, чалавек упадае ў ступар і страчвае здольнасць да разумення, і зусім слаба мoжа штосьці адчуваць, было зусім недалёка...

* * *

Больш выклікаў у навагоднюю ноч не было — людзі святкавалі спакойна. Амапаўцы па дарозе ў РАУС падвезлі мяне да карпункта, каб пісаў гэтыя радкі. Скончыў каля 6 гадзін раніцы. А маім новым знаёмым яшчэ да 8 гадзін трэба было ахоўваць парадак...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

*P.S. Шчырая падзяка аддзяленню інфармацыі і грамадскіх сувязяў Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. Асаблівая падпалкоўніку міліцыі, начальніку аддзялення Вользе Шкуратавай*

# КРЭАТЫЎ У ГАЦУКУ

## Карэспандэнт «Звязды» правяла навагоднюю ноч на вясковай дыскатэцы



**«НАДЗЯ, а можаш крыху пазней прыехаць? Тут форс-мажор выйшаў», — чытаю SMS і заказваю маршрутку на Гацук на больш позні час. Пазней высвятляецца, што згарэла музычная калонка, навагодняя дыскатэка пад пагрозай зрыву. Падлецы людзей Паліна ПАНАМАРОВА, дырэктар Дома фальклору аграгарадка Гацук, што ў Слуцкім раёне, не можа, трэба паспець вырашыць праблему ў апошнія гадзіны 2016 года. Пасада ў Паліны даволі гучная, але яна толькі паўтара года назад скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і прыехала сюды па размеркаванні.**

Дом фальклору ў Гацуку (у аграгарадку жыве каля тысячы чалавек) — гэта месца збору актыўнай часткі жыхароў. Невялічкі зялёны будынак ведаюць усе мясцовыя. Заходзім унутр і адразу аказваемся ў холе з блакітна-белымі сценамі, адкуль можна трапіць у любое памяшканне будынка. «У нас працуюць вакальны, тэатральны і дэкаратыўна-прыкладныя гурткі, праводзім святочныя мерапрыемствы, дыскатэкі», — пералічвае Паліна свае абавязкі. «А гэта мой рабочы кабінет, — запрашае да сябе Паліна. — Заходзь, віп'ем гарбаты і будзем рыхтавацца да свята! Трэба яшчэ рэквізіт для конкурсаў дарабіць!» Сапраўды, на рабочым стале можна заўважыць розныя кардонкі, стужачкі, папяровыя нарыхтоўкі.

Пытаюся ў Паліны, як атрымалася, што яна апынулася тут. Родам дзяўчына з Самары, але дзяцінства правяла ў Беларусі. Калі яшчэ была маленькая, бацькі па рабоце пераехалі ў Мінск. Доўгая камандзіроўка сям'і скончылася, вярнуліся ў Расію. Але сэрца Паліны засталося ў нашай краіне — дзяўчына заказалася. Так, на працягу некалькіх гадоў. Панамарова вандравала па маршруце Самара—Мінск, каб пабачыцца з хлопцам. А калі скончыла школу, дакладна ведала, што ў ВНУ будзе паступаць у беларускай сталіцы.

Цікаўлюся, як прынялі мясцовыя жыхары сталічную дзяўчыну. «Ну, на першай дыскатэцы вынеслі ўваходныя дзверы і паклалі мне іх на рабочы стол, — смяецца Паліна. — Цяпер мне смешна многае ўспамінаць, а як я сябе тады адчувала, ужо і не памятаю. Зразумела, гэта было жаданне прыцягнуць увагу. Ведаеш, акуратненька так знялі і паклалі. «Падлеткі — асноўная аўдыторыя, з якой я працую, — працягвае Паліна. — У сённяшняй святочнай праграме таксама задзейнічала сваіх выхаванцаў. У нас і Дзед Мароз, і Снягурка будзе. Увогуле, лічу, што мая асноўная задача — займаць падлеткаў, каб тыя не тусаваліся невядома дзе. Таму дыскатэкі і розныя мерапрыемствы — гэта добра».

Хутка падапечныя Паліны падцягваюцца на рэпетыцыю. Дзяўчынка з прыгожым імем Мілана ўпэўнена ўваходзіць у кабінет. Яна сёння будзе выконваць ролю Лісы. Крыху пазней прыйшлі Дзед Мароз, Снягурка і Жар-птушка. Усе разам у актавую залу. Сцэна ўжо святочна ўпрыгожана: вялікія сняжынкі, ялінка, агеньчыкі. Прыглушанае святло дапаўняе атмасферу. Паступова падыходзяць астатнія акцёры, а хтосьці проста зайшоў пагутарыць, падзяліцца апошнімі навінамі. Відаць, што падлеткі адчуваюць сябе тут утульна. Гледзячы з боку на выхаванцаў і Паліну Аляксандраўну, можна падумаць, што яны равеснікі — такой юнай выглядае кіраўніца. Але ж субардынацыю ўсе выконваюць строга. «Мікіта, мы ж дамаўляліся! Пяць адцісканняў!» — аказваецца, Панамарова ўзяла за правіла: калі хтосьці з падлеткаў лаецца, той «пла́ціць» штраф. Дзяўчаткі прысядаюць, хлопчыкі адціскаюцца.





За рэпетыцыяй час ляціць хутка. Да Новага года застаецца каля трох гадзін, а нам трэба яшчэ паспець зрабіць шмат спраў. Разам з выхаванцамі выходзім з Дома фальклору і развітваемся на кароткі час. Забягаем дамоў да Паліны, пераапранаемся, выпіваем шампанскае пад бой курантаў і вяртаемся назад у клуб, каб сустракаць гасцей.

«Усё, пачынаецца. Зараз час хутка пойдзе, вось убачыш. Заўсёды хачу, каб усё добра прайшло і ўсім спадабалася», — відаць, што Паліна трошкі хвалюецца. На гадзінніку амаль палова на другую. Зала паступова напаўняецца. Маладыя акцёры таксама рыхтуюцца да выхаду. Як і прадугледжвалася, публіка сабралася розная. Шмат хто прыйшоў цэлымі сем'ямі. Усе вітаюцца, віншуюць, абдымаюцца, сапраўды ж, не бачыліся з мінулага года!

На танцполе горача, тут і там запальваюцца бенгальскія агні. За конкурсамі і танцамі час сапраўды пайшоў імкліва. Нікому не хочацца разыходзіцца, але, на жаль, дыскатэка працуе толькі да 4 гадзін раніцы. Паліна падыходзіць да мікрафона, выбачаецца, што перапыняе гулянне і дзякуе ўсім наведвальнікам. Спаць у гэтую ноч ніхто не збіраецца, аднак для Паліны працоўны дзень скончыўся. Цяпер можна спакойна выдыхнуць і пайсці нарэшце адпачыць. Трэба набрацца сіл, бо сёння ўвечары яе чакае яшчэ адна дыскатэка.

**Надзея БУЖАН, фота аўтара.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Сацыяльны клопат

# ІЗНОЎ АБ ПАДТРЫМЦЫ СЕМ'ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ

**На сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі прайшла анлайн-канферэнцыя, прысвечаная дзяржаўнай падтрымцы сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей.**

Публікуем некаторыя пытанні і адказы на іх супрацоўнікаў міністэрства.

**— Я даглядаю дачку-інваліда і атрымліваю дапамогу па яе доглядзе. Падкажыце, калі будзе ўведзена норма аб тым, што магчыма працаваць на 0,5 стаўкі з атрыманнем дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў?**

**Намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА:**

— Гэтая норма прадугледжана праектам Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Праект Закона быў прыняты 16 снежня 2016 года ў першым чытанні Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Прадугледжана, што ён уступае ў сілу з 1 ліпеня 2017 года.

Інфармацыя аб апублікаванні нарматыўнага прававога акта будзе размешчана ў сродках масавай інфармацыі і на афіцыйным сайце Міністэрства працы і сацабароны.

* * *

**— Ці правамерна атрыманне свабоднага ад работы дня ў тыдзень адным з бацькоў траіх дзяцей да 16 гадоў, калі муж і жонка зарэгістраваны па розных адрасах?**

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК:**

— Маці (мачасе) ці бацьку (айчыму), апекуну (папячыцелю) дадатковы свабодны ад работы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку даецца пры выхаванні імі дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў альбо траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў.

Калі бацькі дзяцей знаходзяцца ў зарэгістраваным шлюбе і пры гэтым адсутнічаюць падставы для аднясення сям'і да катэгорыі няпоўнай, то такая сям'я разглядаецца як поўная. Факт рэгістрацыі мужа і жонкі па розных месцах пражывання не з'яўляецца падставай для адмовы бацьку дзяцей у атрыманні свабоднага дня ў тыдзень.

**Для даведкі:** сям'я разглядаецца як няпоўная ў выпадках, калі:

бацькі, усынавіцелі (удачарыцелі) не знаходзяцца ў шлюбе;

у выпадку смерці мужа (жонкі), прызнання яго (яе) без вестак адсутным (адсутнай), абвяшчэння памерлым (памерлай);

шлюб не скасаваны, але ў дачыненні да мужа (жонкі) вынесена рашэнне суда, вызначэнне пры судовым загадзе аб спагнанні аліментаў на дзяцей або рашэнне суда аб пазбаўленні яго (яе) бацькоўскіх правоў у адносінах да дзяцей;

шлюб не скасаваны, але муж (жонка) змяшчаецца ва ўстанове крымінальна-выканаўчай сістэмы або лячэбна-працоўным прафілакторыі МУС, або адшукваецца органамі ўнутраных спраў па пастанове (вызначэнні) органаў крымінальнага пераследу або суда, альбо прызнаны недзеяздольным у судовым парадку.

* * *

**— Нам як шматдзетнай сям'і налічаны сямейны капітал. У Беларусбанку ўжо адкрыты дэпазітны рахунак. Ці можна датэрмінова скарыстацца сямейным капіталам для куплі або будаўніцтва жылля?**

**Аляксандр РУМАК:**

— Права на распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу даецца па заканчэнні 18 гадоў з даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем, усынаўленнем (удачарэннем) якога сям'я набыла права на прызначэнне сямейнага капіталу.

Датэрмінова сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны толькі на атрыманне членам (членамі) сям'і платных медыцынскіх паслуг, што аказваюцца арганізацыямі аховы здароўя, у парадку і па пераліку, якія вызначаюцца Міністэрствам аховы здароўя.

У цяперашні час іншыя магчымасці датэрміновага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу не разглядаюцца.

* * *

**— З якой даты назначаецца дапамога сем'ям на дзяцей ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — з дня нараджэння малодшага дзіцяці або пасля аплаты бальнічнага па цяжарнасці і родах?**

**Начальнік аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вера ЛАБКОВІЧ:**

— Гэтая дапамога прызначаецца з дня ўзнікнення права на яе, калі зварот па яе прызначэнне адбыўся не пазней за 6 месяцаў з дня ўзнікнення такога права.

У адпаведнасці з нормамі дапамога прызначаецца пры ўмове прызначэння дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Таму заява аб яе прызначэнні можа быць пададзена не раней за дзень падачы заявы аб прызначэнні дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Пры гэтым дапамога прызначаецца і выплачваецца з даты нараджэння малодшага дзіцяці.

* * *

**— Я навучаюся ў ВНУ на дзённым аддзяленні. У перыяд вучобы афармлена на работу на поўную стаўку. Па месцы работы мне аплацілі бальнічны ліст па цяжарнасці і родах, а па месцы вучобы — не, матывуючы тым, што ў мяне работа на поўную стаўку. Ці правамерная адмова?**

**Аляксандр РУМАК:**

— Дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца па месцы работы (службы), вучобы ў дзённай форме атрымання адукацыі. Асобам, якія сумяшчаюць навучанне ў дзённай форме атрымання адукацыі з работай, дапамога прызначаецца і па месцы работы, і па месцы вучобы.

Памер дапамогі вызначаецца зыходзячы з памеру прызначанай жанчыне стыпендыі на дзень наступлення цяжарнасці і родаў. Пры гэтым дапамога не выплачваецца за перыяд, за які выплачана стыпендыя.

З улікам сказанага, факт выканання работы на поўную стаўку і назначэння дапамогі па месцы работы не з'яўляецца падставай для адмовы ў назначэнні дапамогі па месцы вучобы ў дзённай форме атрымання адукацыі.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■ Грошы

# АД СКАРЫНЫ І НАРОДНЫХ ЛЕГЕНДАЎ ДА 950-ГОДДЗЯ МІНСКА

## Нацыянальны банк Беларусі запланаваў да выпуску ў абарачэнне ў наступным годзе 11 найменняў памятных манет

**У прэс-службе рэгулятара нам паведамілі, што менавіта ў 2017-м будзе завершана серыя з шасці памятных манет «Шлях Скарыны», якая прымеркавана да 500-годдзя выдання Бібліі беларускім першадрукаром. На працягу года ў продажы з'явіцца дзве манеты — «Шлях Скарыны. Вільня» і «Шлях Скарыны. Прага». Раней былі выпушчаны манеты «Шлях Скарыны. Полацк» (2015) і «Шлях Скарыны. Кракаў», а таксама «Шлях Скарыны. Падуя» і «Шлях Скарыны. Венецыя» (2016 год).**

У наступным годзе таксама завершыцца выпуск серыі манет «Адроджаныя расліны» ў межах праекта ПРААН па захаванні і адраджэнні зніклых раслін. Будзе выпушчаная манета «Дуброўка скальная» («Лапчатка скальная»).

Вялікай папулярнасцю карыстаецца серыя памятных манет «Помнікі архітэктуры Беларусі». Таму налета чакаецца выпуск манеты «Троіцкі касцёл са званіцай. Чарнаўчыцы». Троіцкі касцёл — унікальны помнік беларускай архітэктуры позняй готыкі і рэнесансу, з выразнымі рысамі абарончага дойлідства Сярэднявечча.

Таксама будзе працягнута серыя памятных манет «Свет вачыма дзяцей», якая пачалася ў 2016 годзе. Дызайн манет заснаваны на дзіцячых малюнках, якія прызнаны пераможцамі адкрытага конкурсу «Дзеці малююць манеты», праведзенага Нацыянальным банкам. У дызайне манет «Свет вачыма дзяцей. 2017» плануецца выкарыстоўваць малюнкі дзяцей ад 7 да 9 гадоў. У 2017 годзе выпускам памятных манет «Легенда пра пчалу» будзе завершана серыя «Беларускія народныя легенды». У рамках гэтай серыі ўжо выпушчаны ў абарачэнне памятныя манеты «Легенда пра бусла», «Легенда пра зязюлю», «Легенда пра жаваранка», «Легенда пра чарапаху», «Легенда пра мядзведзя» і «Легенда пра гіля». У славян пчала заўсёды лічылася божай казюлькай, ад якой карысць і людзям (мёд) і Богу (жоўты воск — Богу на свечкі).

Манеты спартыўнай тэматыкі традыцыйна папулярныя ў Беларусі і за мяжой. З 22 лютага па 5 сакавіка 2017 года ў фінскім горадзе Лахці пройдзе 51-ы чэмпіянат свету па лыжных відах спорту (FIS Nordic World Ski Championships 2017). Да гэтай падзеі Нацыянальны банк выпусціць памятныя манеты «Чэмпіянат свету па лыжных відах спорту 2017 года. Лахці».

Стала ўжо традыцыяй выпускаць памятныя манеты, прысвечаныя птушцы года, якую вызначае грамадскае аб'яднанне «Ахова птушак Бацькаўшчыны». У 2017 годзе такой птушкай абраны жаўрук-смяцюх, або губаты жаўрук. Манета «Жаўрук-смяцюх» стане 10-й у межах гэтай серыі. Згодна з кітайскім календаром, 2018-ы — год Сабакі. У працяг серыі «Кітайскі каляндар» напрыканцы 2017 года будзе выпушчана памятная манета «Год Сабакі».

У наступным годзе будзе святкавацца 950-годдзе заснавання нашай сталіцы. У гонар гэтай падзеі ў пералік на 2017 год уключаны памятныя манеты «Мінск. 950 гадоў».

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*




■ Добрая навіна

# БОЛЬШ ГРУПА — ТАННЕЙ БІЛЕТЫ

**Беларуская магістраль з 1 студзеня павялічыла памер зніжак для арганізаваных груп пасажыраў.**

Зменены ўмовы прадастаўлення зніжак для арганізаваных груп пасажыраў у міжнародных зносінах. Пры праездзе такой групы колькасцю 10 і больш чалавек, якія аплацілі праезд дарослых пасажыраў, па групавому праязному дакументу цяпер дзейнічаюць бонусы ў наступных памерах: 20 працэнтаў ад агульнага кошту праезду пры колькасці групы ад 10 да 24 чалавек, 30 працэнтаў ад агульнага кошту — пры колькасці групы 25 і больш чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ЗВЯЗДА

Беларуская газета

*100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна*




WWW.ZVIAZDA.BY

# 2017

**СТУДЗЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛЮТЫ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | | | | | |

**САКАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

**КРАСАВІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

**МАЙ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

**ЧЭРВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

**ЛІПЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

**ЖНІВЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

**ВЕРАСЕНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

**КАСТРЫЧНІК**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**ЛІСТАПАД**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

**СНЕЖАНЬ**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

Фота Анатоля Клешчука

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# ХРОНІКА НАРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ССР

## Прозвішчы членаў Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР упершыню былі надрукаваны ў «Звяздзе»

**«Вялікім быў год і страшэнным на Каляды Хрыстовы 1918-ы, ад пачатку ж рэвалюцыі другі. Быў ён багаты летам сонцам, а зімою снегам, і асабліва высока ў небе стаялі дзве зоркі: вячэрняя Венера і чырвоны, дрыжачы Марс».**
**Так пачынае свой першы раман «Белая гвардыя» знакаміты рускі пісьменнік, выпускнік Кіеўскага медыцынскага факультэта Міхаіл Афанасьевіч Булгакаў — твор, у якім рамантычнае сустракаецца з трагічным. А якім было жыццё ў першы паслякастрычніцкі перыяд у журналістаў газеты «Звязда»? Звернем увагу на месца друкаванага органа ў тагачаснай гісторыі ўтварэння Беларускай ССР.**
**Увазе чытачоў прапануюцца ўрыўкі з рукапісу кнігі аўтара гэтых радкоў «Гісторыя «Звязды» — гісторыя Беларусі».**

«Звязда» ўбачыла свет, калі ў цэнтры ідэалагічнай барацьбы знаходзіліся праблемы захопу і ўтрымання дзяржаўнай улады. Таму некаторыя аспекты нацыянальнай палітыкі спачатку не сталі полем яе галоўнай дзейнасці. Але ўсё хутка змянілася. З цягам часу супрацоўнікі рэдакцыі былі ў курсе ўсіх інтрыг, звязаных з самавызначэннем Беларусі як асобнай нацыянальна-дзяржаўнай адзінкі. Актыў газеты тады па-ранейшаму складалі А.Ф. Мяснікоў, І.І. Рэйнгольд, Р.В. Пікель, В.Г. Кнорын. Да ліку «тутэйшых» жыхароў адносіўся толькі І.І. Рэйнгольд — ураджэнец мястэчка Грозава Слуцкага павета Мінскай губерні.

У працах некаторых гісторыкаў можна прачытаць аб нібыта меўшых месца кансультацыях У.І. Леніна з Мясніковым па пытанні Беларускай Народнай Рэспублікі: прызнаваць яе дзяржавай ці не. «Звязда», кіруемая А.Ф. Мясніковым, Р.В. Пікелем, В.Г. Кнорыным, І.І. Рэйнгольдам, нейкі час выступала нават і супраць абвяшчэння Беларусі савецкай рэспублікай. Гэта было вынікам веры пэўнай групы «звяздоўцаў» у сусветную рэвалюцыю, якая нібы ліквідавала не толькі дзяржаўныя, але і нацыянальна-этнічныя межы.

**На жаль, амбіцыі часта аказваліся неўтаймоўнымі, нярэдка прыводзілі да рознага роду абвінавачванняў, па якіх у 30-я гады Д.Ф. Жылуновіч быў незаслужана прызнаны арганізатарам антыпартыйнай групы.**

БНР хоць і не адбылася як дзяржава, але ёй належыць важнае месца ў гісторыі Беларусі. У кастрычніку 1917 года Вялікая Беларуская Рада разам з Беларускім абласным камітэтам (арганізацыя беларускіх дэлегатаў пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў) становіцца адным з арганізатараў склікання ў Мінску ў снежні 1917 года 1-га Усебеларускага з'езда па пытаннях краявой улады. Але з'езд ноччу на 18 снежня 1917 года быў разагнаны партыйным і савецкім кіраўніцтвам Заходняй вобласці. Між тым прадстаўнікі з'езда 25 сакавіка 1918 года абвясцілі Беларускую Народную Рэспубліку як незалежную дзяржаву на тэрыторыі, акупаванай войскамі кайзераўскай Германіі. Апошняя не прызнавала і не збіралася прызнаваць якую-небудзь паралельную ўладу.

Асобныя аўтары называюць 24 снежня 1918 года датай прыняцця ЦК РКП(б) нейкага спецыяльнага рашэння аб утварэнні Беларускай ССР. Але гэта не адпавядае рэальнасці. Ніякай такой пастановы, і тым больш на паперы, не адшукана. На нашу думку, існавала вусная дамоўленасць паміж У. Леніным, Я. Свярдловым і І. Сталіным па пытанні рашэння беларускай праблемы.

Ідэя ўтварэння Беларускай рэспублікі належыць беларускім камуністычным секцыям, якія прыйшлі да гэтай высновы ў час правядзення свайго з'езда 21—23 снежня 1918 года ў Маскве.

**25 снежня 1918 года** І.В. Сталін тэлефанаваў А.Ф. Мяснікову: «ЦК партыі рашыў па многіх меркаваннях, аб якіх цяпер гаварыць не прыходзіцца, пагадзіцца з беларускімі таварышамі на ўтварэнне Беларускага Савецкага ўрада».

У той жа дзень у Маскве Д. Жылуновіч давёў да ведама членаў калегіі Белнацкама, Цэнтральнага бюро беларускіх камуністычных секцый пры ЦК РКП (б) і камітэта Маскоўскай беларускай секцыі ЦК РКП(б) рашэнне ўрада РСФСР і кіраўніцтва ЦК РКП(б) «прызнаць неабходнасць абвяшчэння Беларусі як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыянальнай незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай». Удзельнікі пасяджэння, лічачы сябе дастойнымі прадстаўнікамі Беларусі і яе народа, зацвердзілі лічбу 15 як агульную колькасць членаў урада. Тайным галасаваннем яны абралі Д.Ф. Жылуновіча старшынёю будучага беларускага ўрада.

**26 снежня 1918 года** А.Ф. Мяснікоў уносіць у парадак дня чарговай абласной канферэнцыі РКП(б) пытанне аб абвяшчэнні Беларусі Савецкай рэспублікай. Пасля гэтага абласнікі адразу прыступілі да выканання задач нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларускай зямлі.

**27 снежня 1918 года.** У Маскве Сталін сустракаецца з А.Ф. Мясніковым і М.І. Калмановічам і перадае ім для выканання так званыя 6 умоў Сталіна аб утварэнні БССР. Сярод іх: 1. Урад Беларускай Рэспублікі складаецца са Старшыні і 15 членаў урада. 2. Для чарговых спраў існуе прэзідыум з 3 асоб: старшыні ўрада і двух членаў з яго склада. 3. У склад Рэспублікі ўваходзяць губерні: Гродзенская, Мінская, Магілёўская, Віцебская і Смаленская (апошняя над пытаннем на думку мясцовых таварышаў). 4. АК (абласны камітэт. — **Аўт.**) партыі Паўночна-Заходняй вобласці ператвараецца ў Цэнтральнае бюро КП (бальшавікоў) Беларускай Рэспублікі. 5. Старшыня ЦБ партыі павінен быць прадстаўніком ЦК партыі і ўрада. 6. Правы ЦБ партыі і аддзелаў урада застаюцца такімі ж, як былога АК партыі і Аблвыканкамзаха. Па прызнанні Д.Ф.Жылуновіча, «Умовы Сталіна» дапамаглі беларускай частцы ўрада адстойваць свае пазіцыі.

**27 снежня 1918 года** Сталін тэлеграфаваў у Мінск прадстаўніку СНК РСФСР Д.Ю. Гопнеру: «Пытанне (аб утварэнні БССР. — **Аўт.**) не выкліча на канферэнцыі ніякіх спрэчак, бо канферэнцыя будзе мець справу з рашэннем ЦК партыі».

**Масква вуснамі старшыні ВЦВК Свярдлова не толькі пацвердзіла сваё рашэнне, але і паведаміла пра хуткае аб'яднанне БССР з Літоўскай савецкай рэспублікай.**

У Смаленску **30—31 снежня 1918 года** VI абласная партыйная канферэнцыя РКП (б), лічачы сябе першым з'ездам Кампартыі Беларусі, прызнала неабходным «абвясціць самастойную сацыялістычную рэспубліку Беларусі з тэрыторыяй Мінскай (была акупавана германскімі войскамі. — **Аўт.**), Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў».

17 студзеня 1919 года «Звязда» адной з першых пачала друкаваць «Пратаколы VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б)». Канферэнцыя ідэю ўтварэння беларускай савецкай дзяржавы перавяла з тэорыі ў практыку. Гэтую місію мог выканаць і з'езд Саветаў Беларусі. Іншая справа, што не ўсе іх дэпутаты маглі стаяць на пазіцыях партыі, што ўлічвалі ЦК РКП(б) і СНК РСФСР. У Беларусі ўсё адбылося ў адпаведнасці з патрабаваннямі народжанай тады ж палітычнай сістэмы, у якой першае месца адводзілася партыі, а другое — дзяржаўным установам. У гэтай сістэме «Звязда» займала далёка не радавое месца, яна выконвала абавязкі галоўнага друкаванага органа Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б). Хоць некаторыя супрацоўнікі газеты не падзялялі ідэю абвяшчэння Беларусі Савецкай Рэспублікай, яны тым не менш падпарадкаваліся ўказанням ЦК РКП(б).



Дзмітрый Фёдаравіч Жылуновіч (Цішка Гартны), старшыня Часовага рабоча-сялянскага ўрада Савецкай Беларусі, з сынам Алегам.

Святочнай датай нараджэння Беларускай ССР стала **1 студзеня 1919 года** — дзень абнародавання Маніфеста аб аб'яўленні Беларусі дзяржавай. Аўтар гістарычнага дакумента, па сведчанні А.Р. Чарвякова, — Дзмітрый Фёдаравіч Жылуновіч. У Маніфесце абвяшчаўся паўсюдны пераход улады ў рукі Саветаў, дэкларавалася адыход зямлі, фабрык, заводаў, банкаў у валоданне працоўнага народа. У Маніфесце ўжыты розныя назвы беларускай дзяржавы: «Беларуская сацыялістычная савецкая рэспубліка», «Сацыялістычная савецкая працоўная рэспубліка Беларусі», «Савецкая Беларуская Рэспубліка», «Беларуская савецкая незалежная рэспубліка» і інш. Арыгінал дакумента з праўкамі Сталіна знаходзіцца ў Маскве ў былым Цэнтральным партыйным архіве пры ЦК КПСС. У яго падрыхтоўцы, акрамя Д.Ф. Жылуновіча, удзельнічалі члены Беларускіх камуністычных секцый ЦК РКП(б), супрацоўнікі Белнацкама. Упершыню прозвішчы членаў Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР былі



ВЕСТКІ

МАНІХВЭСТ

Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўрада Савецкай Беларусі.

надрукаваны 15.01.1919 года ў «Звяздзе». Не раз мяняўся яго колькасны склад — 15,17 і 19 чалавек.

У склад Прэзідыума ўвайшлі: Жылуновіч — старшыня ўрада, Мяснікоў, Калмановіч. Афіцыйным друкаваным органам урада стала газета «Весткі Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўраду Беларусі», якая выходзіла на беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай (ідыш) мовах. Усе пасяджэнні ўрада адбыліся ў Мінску: 7, 11, 16, 17, 21 і 27 студзеня 1919 года.

З-за напружаных узаемаадносін паміж Жылуновічам і Мясніковым Масква прызначыла сваіх упаўнаважаных: пры ўрадзе БССР — Д.Ю. Гопнера, пры ЦБ КП (б)Б — А.А. Іофе. Незалежнасць Беларусі як дзяржавы ВЦВК РСФСР прызнаў толькі 31 студзеня 1919 года.

31 студзеня 1919 года «Звязда» паведаміла аб правядзенні ў Мінскай губерні прамысловага і прафесійнага перапісу. З 1 лютага 1919 года ў Беларусі ўстанавіўся петраградскі час з пераводам стрэлак на 1 гадзіну наперад. Значная ўвага ўдзялялася фарміраванню і размеркаванню бюджэту. Крыніцы заставаліся тыя ж: адлічэнні ад усіх відаў падаткаў, пазыкі. Пры ўрадзе дзейнічала спецыяльная бюджэтна-фінансавая камісія з прадстаўнікоў камісарыятаў фінансаў, унутраных спраў, дзяржаўнага кантролю для дакладнага і справядлівага размеркавання грошай. Беларусі для выканання аднаўленчых работ патрэбен быў крэдыт у суме 25 млн руб., але выдзялялі ёй толькі 10 млн.

Драматычна для беларускага народа вырашалася тэрытарыяльнае пытанне. Урад Жылуновіча ўзначаліў тэрыторыю рэспублікі ў межах Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай і Смаленскай губерняў. 16 студзеня 1919 года ЦК РКП(б) без папярэдніх кансультацый з кіраўнікамі Беларусі прыняў пастанову аб аддзяленні ад БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. У сувязі з гэтым 22 студзеня 1919 года Жылуновіч, Квачанюк, Чарнушэвіч, Дыла, Шантыр, Фальскі, Чарвякоў і Пузыроў накіравалі пісьмо-пратэст упаўнаважанаму ЦК РКП(б) Іофе. Намаганні ўрада былі падтрыманы членамі ЦБ КП(б) Б. Масква вуснамі старшыні ВЦВК Свярдлова не толькі пацвердзіла сваё рашэнне, але і паведаміла пра хуткае аб'яднанне БССР з Літоўскай савецкай рэспублікай.

У цэлым можна сказаць, што новы дзяржаўны орган быў дзеючым і стваральным, але многае залежала ад асабістых амбіцый тых асоб, якія доўгі час адкрыта выступалі ў прэсе, на пасяджэннях партыйных і дзяржаўных органаў супраць права беларусаў на нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне. На жаль, амбіцыі часта аказваліся неўтаймоўнымі, нярэдка прыводзілі да рознага роду абвінавачванняў, па якіх у 30-я гады Д.Ф. Жылуновіч быў незаслужана прызнаны арганізатарам антыпартыйнай групы.

Друкаванымі органамі Кампартыі Літвы і Беларусі сталі газеты «Звязда» (друкавалася на рускай мове), «Млот» (на польскай), «Камуніст» (на літоўскай), «Штэрн» (на яўрэйскай). Беларуская мова, як бачым, яшчэ заставалася чакаць свайго часу. Захаваліся звесткі аб членах рэдакцый названых газет. Імі былі, у асноўным, кіруючыя дзеячы адпаведных палітычных арганізацый. Так, у рэдакцыю «Звязды» ў літбелаўскі перыяд уваходзілі Мяснікоў, Кнорын і Шутко, пасля зыходу апошняга ў гэтай якасці з'явіўся Міцкявічус-Капсукас. Членамі рэдакцыі «Млота» з'яўляліся Ляшчынскі і Цыхоўскі; рэдакцыю літоўскай газеты «Камуніст» узначальваў Аляксандр Ангарэціс; яўрэйскую «Штэрн» рэдагавалі Мандэльберг і Кроль.

Некалькі дзесяткаў гадоў адміністрацыя Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва (М.І. Камінскі, В.Д. Сяляменеў) збірала звесткі аб лёсах членаў урада Д.Ф. Жылуновіча. Высветлілася, што дажылі да старасці С.В. Іваноў, К.Ф. Разенталь, В.Л. Дыла, І.П. Савіцкі; А.Ф. Мяснікоў загінуў у 1925 годзе ў авіяцыйнай катастрофе, Д.Ф. Жылуновіч памёр у час незаконнага зняволення ў турэмнай бальніцы; І.І. Рэйнгольд, Р.В. Пікель, М.І. Калмановіч, Д.С. Чарнушэвіч, У.І. Яркін былі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання, і рашэнні гэтыя выкананы ў 30-я гады (пазней усе рэабілітаваны). А.Р. Чарвякоў паконччыў жыццё самагубствам у 1937 годзе, С.І. Берсан загінуў па віне польскіх легіянераў. У маі 1919 года незаконна расстраляны Р.П. Найдзенкаў. У маі 1920 года расстраляны Ф.Г. Шантыр. Звесткі аб лёсах членаў урада А.А. Андрэева, І.І. Пузырова, А.І. Квачанюка, У.С. Фальскага абрываюцца 20 гадамі з-за адсутнасці якіх-небудзь даных.

**Яўген БАРАНОЎСКІ, кандыдат гістарычных навук**

# ХАКЕЙ НА КАЛЯДЫ

**Заўтра стартуе традыцыйны міжнародны аматарскі турнір на прызы Прэзідэнта**

**Зборная Балкан (за якую згуляюць былыя прадстаўнікі краін былой Югаславіі, Балгарыі, Румыніі і Турцыі), каманда Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і швейцарцы будуць гуляць на папярэднім этапе ў групе А разам з лядовай дружынай кіраўніка нашай дзяржавы. Групу В складуць ветэраны хакея з Расіі, Германіі, Фінляндыі і Славакіі.**

Як і ў мінулыя гады, на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» каманды спачатку правядуць матчы ў двух квартэтах, пасля чаго пройдуць стыкавыя сустрэчы: пераможцы груп 7 студзеня сустрэнуцца ў вырашальным паядынку за галоўны прыз, а другія каманды разыграюць бронзу.

У сувязі з правядзеннем Каляднага турніру ў сталіцы арганізуюцца дадатковыя маршруты пасажырскага транспарту. Так, тралейбусны маршрут №926 «Ст.м. «Аўтазаводская» — «Чыжоўка-Арэна» будзе працаваць 4 студзеня ў перыяд з 11.00 да 22.00; 5 студзеня — з 12.00 да 22.00, 6 студзеня — з 13.00 да 22.00; 7 студзеня — з 11.00 да 22.00. Акрамя таго, 7 студзеня з 11.00 да 13.00 і з 15.00 да 18.00 арганізуецца работа аўтобуснага маршруту №926 «Ст.м. «Аўтазаводская» — «Чыжоўка-Арэна». Будзе павялічана колькасць рухомага саставу на тралейбусным маршруце №49 з 11.00 да 18.00.

## Расклад гульняў

**4 студзеня**
12.00 Фінляндыя — Германія (малая арэна)
13.00 Зборная Балкан — Швейцарыя (вялікая арэна)
15.30 Славакія — Расія (малая арэна)
17.30 Цырымонія адкрыцця турніру (вялікая арэна)
19.00 БЕЛАРУСЬ — ААЭ (вялікая арэна)

**5 студзеня**
13.00 Расія — Фінляндыя (малая арэна)
14.00 ААЭ — Швейцарыя (вялікая арэна)
17.00 Германія — Славакія (малая арэна)
19.00 БЕЛАРУСЬ — Зборная Балкан (вялікая арэна)

**6 студзеня**
15.00 Расія — Германія (малая арэна)
14.00 ААЭ — Зборная Балкан (вялікая арэна)
19.00 Фінляндыя — Славакія (малая арэна)
19.00 Швейцарыя — БЕЛАРУСЬ (вялікая арэна)

**7 студзеня**
13.00 Матч за 3-е месца (вялікая арэна)
18.00 Фінал. Цырымонія закрыцця турніру (вялікая арэна).

■ Вандруем!

# ТАЙНА РЫЖСКІХ ПЕЎНІКАЎ

**Напярэдадні Года Пеўня карэнны рыжанін расказаў «Звяздзе» пра сімвал свайго горада — Залатога пеўніка, а таксама звязаныя з ім легенды і гісторыі.**

## ПАЗАЛОЧАНЫЯ АГНЁМ

Пеўнікі рыжскіх шпіляў сустракаюць усіх, хто набліжаецца да Старога горада, упрыгожваюць яны і тры галоўныя шпілі латвійскай сталіцы, пазіраючы адтуль на Рыгу і на ўсё, што ў ёй адбываецца.



На гэтым флюгеры надпіс: «Я — копія свайго папярэдніка, Домскага пеўня, які нарадзіўся ў 1595 годзе, быў упрыгожаны ў 1666 годзе і пазалочаны агнём у 1777 годзе».

Дакладна вядома, што першы пеўнік у Рызе з'явіўся на шпілі царквы Пятра яшчэ ў 1491 годзе. Лёс яго быў няпросты. За больш як пяцьсот гадоў птушку мянялі семь разоў. Першы прастаяў 85 гадоў, не вытрымаўшы буры 1576 года, якая пагнула яго. Другі ахоўваў горад менш за год. Трэці пачаў сваю службу ў 1578 годзе і гэтак жа, як і першы, дажыў да сур'ёзнага ўзросту ў 73 гады. Вядома, што чацвёрты пеўнік мог усё пахваліцца залатымі бакамі. Трагічны лёс быў у пятага . У 1666 годзе ён упаў разам з вежай, якая, як высветлілася, была пабудавана без падмурка.

Шосты пеўнік гарэў двойчы. У 1721 годзе ў вежу трапіла маланка і царква загарэлася. Кажуць, што Пётр I, які знаходзіўся ў той час у Рызе, асабіста ці то тушыў пажар, ці то кіраваў яго тушэннем. Пасля аднаўлення вежы пеўнік вярнуўся на месца, але другі раз пацярпеў ад пажару 29 чэрвеня 1941 года. Цяпер гэты пеўнік знаходзіцца ў царкве, а шпіль упрыгожвае яго копія — сёмы па ліку флюгер. Усталяваны ён у 1970 годзе. Сёмы пятроўскі пеўнік вельмі вялікі: даўжыня 210 см, вышыня 153 см пры баявой вазе 158 кг.

На шпілі Домскага сабора пеўнік з'явіўся пасля пабудовы новай пірамідальнай вежы ў 1595 годзе. Папярэдняя згарэла ў 1547-м падчас святкавання Тройцы. Гэты пеўнік быў заменены на копію ў 1985 годзе. Арыгінал знаходзіцца ў крыжовай галерэі Домскага сабора. Падчас апошніх рэстаўрацыйных работ Домскі пеўнік быў таксама адноўлены і зноў заняў сваё месца на шпілі 29 верасня 2015 года. Важыць гэтая пазалочаная птушка 86 кг. На флюгер нанесены надпіс: «Я — копія свайго папярэдніка, Домскага пеўня, які нарадзіўся ў 1595 годзе, быў упрыгожаны ў 1666 годзе і пазалочаны агнём у 1777 годзе».

Пра пеўніка Домскага сабора казалі, што ў сярэднія вякі з аднаго боку ён быў залаты, з другога — чорны. Калі вецер дзьмуў з мора, па Даўгаве ў Рыгу маглі зайсці караблі, гандаль ажываў і пеўнік павархваўся да горада сваім залатым бокам. Калі вецер дзьмуў у бок мора, караблі падысці да горада не маглі, жыццё замірала, а пеўнік паварочваўся чорным бокам. Гэта легенда, але, калі ўважліва паглядзець на пеўніка, які захаваўся, то відаць, што пазалочаныя былі абодва бакі. Пры гэтым адзін бок сапраўды больш чорны. Тлумачэнне простае — салёны марскі вецер адпаведны бок закрануў больш. Так што ў кожнай легендзе ёсць свая доля праўды.

Царква Екаба атрымала сваю вежу разам з першым пеўнікам у 1596 годзе. Падчас дзевяцімесячнай аблогі і штодзённых артабстрэлаў з боку рускай арміі ў 1710-м пеўніка прыйшлося мяняць, адбылося гэта, праўда, толькі праз 26 гадоў. У 80-я гады XX стагоддзя пасля моцнай буры пеўнік царквы Екаба зноў пацярпеў, так што цяпер на шпілі знаходзіцца трэці флюгер.

На шпілі царквы Іаана сядзіць самы малады з царкоўных пеўняў Старога горада. Упершыню ён з'явіўся ў 1680 годзе і ўвенчвае невялікую мініяцюрную копію вежы царквы Пятра. Будаваў абедзве вежы адзін майстар — Руперт Біндэшу. Гэты певень аглядаў горад зверху 84 гады — да 20 мая 1764-га, калі яго замянілі на новага. І вось гэтая птушка здзейсніла невялікае падарожжа. 18 лістапада 1848 года моцная бура расхістала вежу. Новую, але ўжо гатычную, у 1849 годзе пабудаваў галоўны архітэктар горада Еган Даніэль Фельско. Вежу вянчае крыж, а пеўніка змясцілі на паўночна-заходні франтон царквы.

## ЧАМУ — ПЕЎНІ?

Ёсць меркаванне, што гэты сімвал звязаны з лютэранствам. Але лютэранства адлічвае сваю гісторыю з 1517 года, а першы пеўнік упрыгожваў Рыгу ўжо ў 1491 годзе.



Другі Домскі пеўнік. На фота зафіксаваны працэс дэмантажу будаўнічых лясоў у 1985 годзе.

Яшчэ кажуць, што гэта знак пільнасці, і спасылаюцца на Евангелле. Ён (Хрыстос) сказаў Пятру: «Праўду кажу табе, што ты сёння, у гэтую ноч, перш чым двойчы заспявае певень, тройчы адрачэшся ад мяне». (Мк.14,30.) Але, як мне здаецца, такое меркаванне пра рыжскія флюгеры не справядлівае ў адносінах да Пятра, які з'явіўся краевугольным каменем хрысціянскай Царквы.

Тады ўжо больш лагічным можа быць варыянт, звязаны з тым, што рэлігійныя людзі баяцца нячыстай сілы, а яна, у сваю чаргу, баіцца сонечнага святла. І чым вышэй падняць пеўніка, тым хутчэй ён убачыць сонца і тым больш вялікую тэрыторыю будзе ахоўваць.



У Старым горадзе знаходзіцца падарунак горада Брэмена — аднайменныя музыканты. Вядома, і сярод іх ёсць пеўнік.

Існуе і фальклорная версія. Настаяцель адной з рыжскіх цэркваў захацеў курацiны і сказаў пастве, каб прынеслі курыц. Прыйшла першая гаспадыня і залямантавала, што курачкі нясуць яйкі, а вось у яе ёсць два пеўні, якія ўвесь час паміж сабой б'юцца. Ці можна аднаго з іх? Святар пагадзіўся: можна і пеўня замест курыцы. Калі прыйшла трэцяя гаспадыня з такім жа пытаннем, настаяцель усталяваў на вежы царквы выяву пеўня, каб усе бачылі, што можна прыносіць яму не толькі курыц.

Але самым праўдападобным мне здаецца наступны варыянт. Справа ў тым, што ў 1485 годзе ў горадзе Нюрнбергу была выдадзена кніга «Speculum naturale» — «Люстэрка прыроды». Гэта энцыклапедыя ведаў аб прыродзе, аб тым, як яе ўяўлялі людзі 500 гадоў таму. Дык вось, там гаворыцца, што пеўні ўсталёўваюцца на шпілі цэркваў як флюгеры, каб яны разварочваліся насустрач ветру і сваім спевам адганялі дэманаў буры. Можа быць таму ў Рызе так мала бур?

Пры гэтым пеўні ёсць і ў суседняй Эстоніі, і ў Германіі. Шмат пеўняў у Францыі, асабліва ў Нармандыі. У Англіі таксама нямала пеўняў-флюгераў. Адну з вежаў сабора Мацвея ў Будапешце ўпрыгожвае певень. І нават званіцу абацтва Успення ў Ерусаліме ўвенчвае пеўнік.



На шпілі царквы Іаана сядзіць самы малады з царкоўных пеўняў Старога горада — з 1680 года.

Але вернемся ў Рыгу. Ёсць на Домскай плошчы месца, з якога дасведчаны чалавек можа ўбачыць адразу сем пеўняў. Тры відавочныя — на шпілях цэркваў Пятра, Екаба і Домскага сабора. Чацвёрты з 2003 года ўпрыгожвае невялікую вежку гасцініцы «Гутэнберг». Яшчэ адзін певень прымасціўся побач з фігурай Меркурыя на фасадзе былой біржы, а цяпер Музея замежнага мастацтва. На будынку біржы размешчаны тры фігуры Меркурыя. Яшчэ ў Старым горадзе ёсць падарунак горада Брэмена — аднайменныя музыканты. Вядома, і сярод іх ёсць пеўнік.

У сувязі з тым, што певень сёлета шануецца і як знак кітайскага гараскопа, адпаведна ён звязаны з навагоднімі святамі, неабходна згадаць пра пеўнічка, які ўпрыгожвае «лічбавую» ёлку, якая знаходзіцца побач з Ратушнай плошчай. У Рызе навагодняя ёлка згадваецца ў 1510 годзе. Гэта першая згадка пра ўбраную ёлку ў свеце, і штогод пад Новы год тут праводзіцца фестываль ёлак, а «лічбавая» або дыгітальная ёлка побач з Ратушай упрыгожвае Рыгу цэлы год.

Ёсць такі выраз «трымаць нос па ветры», але я хачу пажадаць у надыходзячым годзе паводзіць сябе так, як гэта робяць пеўнікі Рыгі — разварочвацца насустрач ветру, гэта значыць, смела глядзець на любыя жыццёвыя сітуацыі і быць гатовым да іх вырашэння!

**Сяргей ІВАНЧАНКА, рыжскі гід** ■



Яшчэ адзін певень прымасціўся побач з фігурай Меркурыя на фасадзе былой біржы, а цяпер Музея замежнага мастацтва.

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА СТУДЗЕНЬ



**3 студзеня, аўторак.** Каб пазбегнуць канфліктаў з блізкімі або калегамі, стрыгчы і афарбоўваць валасы ў гэты дзень не рэкамендуецца. Прычоску зрабіце строгую.

**4 студзеня, серада.** Каб атрымаць больш энергіі, зрабіце лёгкую, бязважкую прычоску. Але стрыгчы валасы пакуль не рэкамендуецца.

**5 студзеня, чацвер.** Стрыжка прывядзе да даволі негатыўных наступстваў. Каб не страціць упэўненасць у сабе, афарбоўку валасоў таксама варта адкласці да больш спрыяльнага дня.

**6 студзеня, пятніца.** Дзявятыя месяцавыя суткі лічацца сатанінскім днём. У гэты дзень не стрыжыце валасы! Афарбоўка — толькі ў натуральныя адценні, каб пазбавіцца ад негатыву. Высокая прычоска дапаможа захаваць сваю энергію.

**7 студзеня, субота.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі. Наведванне цырульні можа скончыцца пагаршэннем самаадчування. Сёння часцей расчэсвайце валасы, каб атрымаць касмічную энергію.

**8 студзеня, нядзеля.** Сёння трэба стрыгчы валасы для захавання жыццёвых сіл і пазітыўнай энергіі. Калі афарбаваць валасы натуральнымі сродкамі, можна атрымаць станоўчую дынаміку ў працы.

**9 студзеня, панядзелак.** Калі хочаце атрымаць дадатковыя фінансы — абстрыжыце валасы сёння. Афарбоўка таксама абяцае павелічэнне прыбытку, асабліва калі колер будзе з залацістым адценнем.

**10 студзеня, аўторак.** Стрыжка валасоў дабратворна ўплывае на іх рост, а таксама на рост грашовага дабрабыту.

**11 студзеня, серада.** Негатыўны дзень для паходу ў салон прыгажосці. Адкладзіце афарбоўку і стрыжку, сёння вынік наўрад ці парадуе.

**12 студзеня, чацвер.** Сёння не варта стрыгчы валасы, становішча месяца ў першую чаргу дрэнна ўплывае на стан валасоў. Стрыжка прывядзе да дэпрэсіі.

**13 студзеня, пятніца.** Спрыяльны дзень. Стрыжка атрымаецца ўдалай, валасы стануць гусцейшымі, карані ўмацуюцца. Але расці валасоў будзе больш павольны. Калі вас пераследуюць няўдачы, стрыжка дапаможа ад іх пазбавіцца.

**14 студзеня, субота.** Усім, у каго ёсць праблемы са здароўем, рэкамендуецца наведаць цырульню! Мала таго што новая прычоска дапаможа аздараўленню арганізма, дык і фінансавы дабрабыт прыцягне!

**15 студзеня, нядзеля.** Каб прадухіліць выпадзенне валасоў, зрабіце стрыжку сёння. Таксама ўзмоцніцца рост валасоў, прычоска будзе пышнай, валасы паслухмянымі, а кончыкі перастануць секчыся.

**16 студзеня, панядзелак.** Стрыжка дапаможа захаваць і ўмацаваць здароўе, надасць сіл, энергіі. Астрыжаныя валасы будуць хутка расці, трымаць форму і перастануць выпадаць.

**17 студзеня, аўторак.** Месяц убывае, стрыгчы валасы нельга. Яны стануць тонкія, непаслухмяныя, могуць пачаць віцца. Укладка ператворыцца ў катаванне. І ад афарбоўвання лепш адмовіцца.

**18 студзеня, серада.** Стрыжку варта рабіць толькі ў тым выпадку, калі хочаце, каб валасы сталі больш аб'ёмнымі. Расчэсвайце валасы перад люстэркам, думаючы пра штосьці добрае, каб у ваша жыццё прыйшла пазітыўная энергія.

**19 студзеня, чацвер.** Сёння стрыжка ніяк не паўплывае на стан валасоў, але можа негатыўна адбіцца на здароўі і грашовай энергіі. Калі ў вас доўгія валасы, ні ў якім разе коратка не стрыжыцеся. Стрыжка вам не спадабаецца, ды і энергіі забярэ шмат.

**20 студзеня, пятніца.** Калі ў вас ломкія, цёмныя і вельмі тонкія валасы, пастрыжыце іх сёння, каб зрабіць больш жорсткімі і густымі. Рост валасоў замарудзіцца, але карані ўмацуюцца.

**21 студзеня, субота.** Калі хочаце пазбегнуць непрыемнасцяў, адкладзіце стрыжку. Фарбаваць валасы можна толькі натуральнымі фарбамі. Сёння не выкарыстоўвайце ніякай хіміі.

**22 студзеня, нядзеля.** Сённяшняя стрыжка прынясе адны расчараванні. Валасы хутка адрастуць, але стануць непаслухмянымі, тонкімі, ломкімі. Прычоска не будзе трымаць форму і наўрад ці прынясе радасць.

**23 студзеня, панядзелак.** Стрыжка валасоў сёння супрацьпаказаная. Дзень вельмі цяжкі, таму ўявіце, што вашы валасы — гэта праваднікі, якія выпраменьваюць энергію любові і дзейнічаюць як купал, які абараняе вас ад усякага зла.

**24 студзеня, аўторак.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі. Нават простае падраўноўванне кончыкаў можа прывесці да сур'ёзнай дэпрэсіі. Афарбоўку таксама адкладзіце.

**25 студзеня, серада.** Сёння можна стрыгчы валасы, праводзіць эксперыменты, кардынальна мяняць іх даўжыню і колер.

**26 студзеня, чацвер.** Стрыжка надасць больш энергіі, жыццёвых сіл. Уплыў на валасы станоўчы: павялічыцца аб'ём, паменшыцца выпадзенне.

**27 студзеня, пятніца.** Калі рашыцеся на стрыжку менавіта сёння, майце на ўвазе, што гэта павінен быць крайні выпадак. А даўжыня астрыжаных валасоў не большая за тры сантыметры. Наогул, стрыгчы валасы не рэкамендуецца. Затое афарбоўка ў яркія ненатуральныя колеры пройдзе выдатна!

**28 студзеня, субота.** Сёння можна стрыгчы валасы, каб паскорыць іх рост, палепшыць паток энергіі здароўя і грошай. Можна справаваць кардынальна мяняць колер валасоў. Усе эксперыменты акажуцца ўдалымі.

**29 студзеня, нядзеля.** Стрыгчы валасы непажадана, яны могуць пачаць выпадаць. Валасы расчэсвайце на працягу дня па колькасці поўных гадоў. Гэта дапаможа пазбавіцца ад негатыву і прыцягнуць у жыццё пазітыў.

**30 студзеня, панядзелак.** Сёння валасы не варта ні стрыгчы, ні нават мыць. З-за ўздзеяння на скуру галавы можа з'явіцца перхаць. Процілаказаныя хімічная завіўка і афарбоўка. Валасы будуць сапсаваныя.

**31 студзеня, аўторак.** Ад стрыжкі варта ўстрымацца. Асвятленне валасоў прыроднымі сродкамі дапаможа знайсці патрэбных людзей. Прычоску зрабіце пышную, каб прыцягнуць энергію космасу па максімуме.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 17.01 | 7.33 |
| Віцебск — | 9.25 | 16.43 | 7.18 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.51 | 7.33 |
| Гомель — | 9.06 | 16.56 | 7.50 |
| Гродна — | 9.42 | 17.18 | 7.36 |
| Брэст — | 9.34 | 17.27 | 7.53 |

### Месяц

*Першая квадра 5 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

*Пр.* Ульяны, Міхаіла, Мікіты, Пракопа, Пятра.
*К.* Данута, Гервазія, Люцыяна, Пятра.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**1 студзеня, 5 гадзін раніцы. Гаспадыня дома:**
**— Нешта сумна стала... Пойдзем, госці дарагія, хоць посуд памыем!**

Сезон «Не чапай, гэта на Новы год!» аб'яўляецца закрытым!

**— Як прайшоў Новы год?**
**— Як гэта прайшоў?!**

Прыйшоў на Новы год дадому без падарункаў?
Значыць, кукіш табе ночку, а не Снягурку!

**Купіла падарункі да Новага года. Дзве машынкі з радыёкіраваннем, каб муж з дзіцем не пабіліся...**

— Пажадаў на Новы год хоць бы крыху пажыць у «шакаладзе».

— Ну і як?
— Заснуў тварам у шакаладным торце.

**Дарагі Дзядуля Мароз! На мінулы Новы год я прасіла ў цябе хлопца. Дык вось, забяры назад гэтага дурня і давай лепш мандарынкі!..**

Маленькі хлопчык напісаў Дзеду Марозу:
— Прышлі мне, калі ласка, брацікА.
Дзед Мароз адказаў:
— Няма праблем. Прышлі мне сваю маму.




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

Даты | Падзеі | Людзі

### 3 СТУДЗЕНЯ

**1024** год — нарадзіўся Ізяслаў Яраславіч (у хрышчэнні Дзмітрый), князь тураўскі, вялікі князь кіеўскі (з 1054), старэйшы сын Яраслава Мудрага. Адзін з укладальнікаў «Праўды Яраславічаў». У 1067 годзе з братамі Святаславам і Усевададам ваяваў супраць полацкага князя Усяслава Брачыслававіча, захапіў яго ў палон. У 1068 годзе звергнуты ў выніку народнага паўстання. Двойчы з дапамогай нямецкіх і польскіх феадалаў вяртаўся да ўлады. Загінуў у міжусобнай барацьбе ў 1078 годзе.



**1738** год — нарадзіўся (маёнтак Яшнец, цяпер у Лідскім раёне) Казімір Нарбут, беларускі асветнік, прадстаўнік эклектычнага напрамку ў філасофіі эпохі Асветы ў Беларусі і Літве. Выступаў за вызваленне філасофіі ад схаластыкі і багаслоўя, за развіццё навукі. Адстойваў ідэю неабходнасці шырокай свецкай адукацыі, якая спрыяе фарміраванню развітой асобы. Аўтар курсу «Эклектычная філасофія» і шэрагу рукапісаў на лацінскай мове. У 1769 г. выдаў у Вільні першы падручнік логікі. Памёр у 1807 годзе.

**1947** год — 70 гадоў таму нарадзіўся (вёска Жыцькава Барысаўскага раёна) Васіль Гігевіч, беларускі пісьменнік. Аўтар аповесці «Марсіянскае падарожжа», рамана «Кентаўры», навукова-дакументальнай кнігі пра Чарнобыль «Сталі воды горкімі» і іншых твораў. Адзін з першых у беларускай літаратуры стаў распрацоўваць тэму горада, уплыву навукова-тэхнічнай рэвалюцыі на традыцыйную мараль і псіхалогію. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1982).

**1947** год — нарадзілася (вёска Чачэвічы Быхаўскага раёна) Раіса Пятроўна Балакіна, канструктар касмічнай тэхнікі. Мае дачыненне да стварэння касмічнай станцыі «Мір», лятальнага апарата шматразовага выкарыстання «Буран», міжнароднай касмічнай станцыі «Альфа».

**1928** год — нарадзіўся (вёска Некрашэвічы, цяпер у Карэліцкім раёне) Уладзімір Аляксандравіч Палуян, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар. Аўтар даследаванняў па праблемах аграрных адносін, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, гісторыі калгаснага сялянства і інтэлігенцыі ў БССР у 1921—1941 гадах. Адзін з аўтараў «Гісторыі Беларускай ССР» у 5 тамах, «Гісторыі СССР» у 12 тамах.

### Было сказана

**Эрых Марыя РЭМАРК, нямецкі пісьменнік:**
*«Пра характар чалавека па-сапраўднаму можна даведацца, калі ён стане тваім начальнікам».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 5010.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 студзеня 2017 года.